# Змест


Срэбны боцік . . . . . 5
Віржыні П'яці, Кабукі

Пані Мядзведзіца нічога не паспявае . . . . . 13
Карын Машон, Сандрын Ламур

Уладца пяску . . . . . 21
Фларын Танар, Элан Лескаа

Як добра ў бабулі! . . . . . 29
Ларанс Берто-Маке, Ваюнэт

Нялёгка быць старэйшым братам . . . . . 37
Алін дэ Пеціні, Эстэль Мадэдзю

Людаед-вегетарыянец . . . . . 53
Мірэй Савер, Жэрэмі Парыжы

Сонь не спіць . . . . . 61
Жыну Жусэль, Леа Фабрэ

Трус Якуб лапамі туп . . . . . 69
Веранік Кушы, Стэфані Аластра

Леон і Ратату . . . . . 77
Карын Машон, Стэфані Ранзон

Нечаканая сяброўка . . . . . 93
Фларын Танар, Ваюнэт

Чарадзейная рыбалка . . . . . 101
Калуан, Эстэль Мадэдзю

Баяка, палахлівы дыназаўр . . . . . 109
Віржыні П'яці, Сандрын Ламур

Арчыбальд не хоча спаць . . . . . 117
Алін дэ Пеціні, Эстэль Мадэдзю

Мішка, Лань і Мышка . . . . . 133
Карын Машон, Стэфані Аластра

Кацяняты са сну . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
Бэці Серэ дэ Рыўер, Элан Лескаа

Лісяня Хітрун і фея салодкіх сноў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
Ларанс Берто-Маке, Жэрэмі Парыжы

Архідэя і Дыназаўрык у бабулі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Карын Машон, Стэфані Ранзон

Новы ложак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 171
Мірэй Савер, Леа Фабрэ

Дамы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
Карын Лазар, Кабукі

Цынамон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
Эла Каальман, Жэрэмі Парыжы

# Срэбны боцік

Віржыні П'яці, Кабукі



Мілая шэрая мышка Флавія вяртаецца з рынку, і на сэрцы ў яе радасна. Яна ідзе лясной сцежкай і спявае песеньку пра найсмачнейшы ў свеце сыр з дзіркамі.

Мышка спяшаецца дадому, каб хутчэй распакаваць яго і пакаштаваць!

Мышка ўжо амаль дайшла дадому, як раптам заўважыла, што пад дрэвам нешта свеціцца.

Яна падыходзіць — і падымае з зямлі маленькі **срэбны боцік**.

Флавія разглядаецца. Хто згубіў цудоўны боцік?

Яго гаспадыня, напэўна, вельмі засмуцілася!

**Але вакол — нікога.**

А варта заўважыць, што зіма цяпер суровая, і ніхто нават носа вонкі не паказвае, акрамя маленькай галоднай мышкі.



# *Уладца пяску*

Фларын Танар, Элан Лескаа



**Аліса вельмі любіць казкі.**

А найбольш — казку пра ўладцу пяску.

У ёй уладца пяску лётае на дыване-самалёце і пасыпае дахі дамоў залатым пяском, каб дапамагчы дзецям заснуць і ўбачыць цудоўныя сны.

У першы дзень снежня ва ўсёй краіне здараецца дзіўнае.
Дзеці перастаюць спаць. Цяпер яны на нагах не толькі днём, але і ноччу!

Аліса ўпэўненая: гэта праз уладцу пяску. Можа, ён знік?

**Трэба яго знайсці.**

Дзяўчынка разгортвае сваю кнігу і шукае патрэбную казку.



# Людаед-вегетарыянец

Мірэй Савер, Жэрэмі Парыжы



**Жыў-быў...**

Праглот — велізарны, як бочка, людаед, кудлаты і з кусцістымі бровамі.



# Сонь не спіць

Жыну Жусэль, Леа Фабрэ



**— Вух! Вух! —**

вухае маленькае савяня. — Не хачу спаць!

**Вух! Вух! Вух!**

Але ўжо раніца, і першыя промні сонца паказаліся з-за небакраю.

Сям'і соў час класціся спаць.

Яны ж працавалі ўсю ноч!

Палявалі, скакалі па велізарных дрэвах з галінкі на галінку!

Лёталі адведаць сяброў у суседні лес!

І, вядома, вельмі стаміліся.

Усе, акрамя...

**Соня, які не хоча спаць.**

**ЗУСІМ.**

— Хачу весяліцца! — лямантуе Сонь. — І лётаць!

І ўлюлюкаць!

**УЛЮЛЮ!**

Ну і гарэза!

— Чаму я мушу класціся спаць, калі ўсе ўстаюць? Ноччу не ўбачыш прыгожых кветак, цудоўнага сіняга неба, белых аблокаў...

